# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (747) ✦ Пятніца, 23 мая 1969 г. Цана 2 кап. Год выдання XXII


## ЗАЛІКОЎКІ РАСКРЫТЫ!

Зноў, як і кожную вясну, увесь рытм універсітэцкага жыцця падпарадкаваўся экзаменацыйнай сесіі. Яна — галоўная падзея дня, на якой канцэнтруецца ўвага універсітэцкага калектыву.

Зранку каля аўдыторый у гуманітарным, фізічным, хімічным, біялагічным, галоўным карпусах збіраюцца групы юнакоў і дзяўчат. Стрыманы гоман, узаемнае апытанне, шэлест старонак канспектаў і кніг адразу ж далучаюць да экзаменацыйных хваляванняў.

— Ну, што? Якія пытанні? Чаму так доўга сядзеў? З чым павіншаваць? — так выказваецца сяброўская зацікаўленасць, калі адчыняюцца дзверы.

Большасць студэнтаў здае пакуль залікі. На юрыдычным факультэце сесію адкрылі першакурснікі залікам па гісторыі КПСС.

А выпускнікі-географы паспяхова трымалі свой першы дзяржаўны экзамен па палітэканоміі. Залік па акеанаграфіі прыняў у другакурснікаў прафесар В. А. Дзяменцьеў.

На фінішы — геолагі. Яны ўжо разлічваюцца з апошнімі экзаменамі і рыхтуюцца да практыкі. У трэцякурснікаў яна пачнецца з 25 мая ў Крыме, а першакурснікі і студэнты II курса правядуць практыку ў базавым гарадку непадалёку ад Мінска.

— Вельмі добра здаюць сесію геолагі, — расказвае інжынер-картограф С. Ф. Тумішская.— У студэнтаў III курса ў гэтую сесію пяць залікаў і тры экзамены. Вось, напрыклад, вынікі экзамена па петраграфіі: у другой групе з 25 чалавек толькі двое атрымалі здавальняючыя адзнакі, астатнія — выдатныя і добрыя. У першай групе экзаменатар — старшы выкладчык С. А. Ціханаў—ацаніў на здавальняюча веды толькі пяцярых студэнтаў.

На біяфаку у многіх радаснае здзіўленне. Студэнты чацвёртай групы II курса здалі дыферэнцыраваны залік па фізкалоіднай хіміі толькі на добра і выдатна. І гэта Ф. М. Капуцкаму, залік у якога не многія атрымлівалі з першага заходу.

Што, «змякчэла» сэрца ў выкладчыка? Аб гэтым даведаліся пасля размовы з экзаменатарам, кандыдатам хімічных навук Ф. М. Капуцкім.

— Сапраўды, як ніколі, да заліку па фізкалоіднай хіміі студэнты-біёлагі падрыхтаваліся добра. І мне прыемна. Але, каб адказалі так добра усе, не чакаў, хоць і марыў аб такіх хвілінах. Поспех не выпадковы. І вось чаму. Шмат залежала ад старшага выкладчыка, кандыдата хімічных навук М. Г. Рафальскага, які вёў практычныя заняткі ў некалькіх падгрупах. Частка — і ад работы кафедры, дзе прапанавалі замест звычайнага заліку — дыферэнцыраваны. Ды і самі студэнты ўпэўніліся, што на сучасным этапе біялагічныя навукі нельга адрываць ад іншых, асабліва ад хімічных і фізічных.

Цяпер зусім зразумела, што поспех другакурснікаў не выпадковы.

## АЎТОГРАФ ВЫПУСКНІКА

У розных кутках Беларусі працуюць выпускнікі нашага універсітэта. Як правіла, яны не толькі добрыя спецыялісты, але і актыўныя грамадскія дзеячы.

Журналіст Аляксандр Пятровіч Грышан шмат гадоў працаваў у рэдакцыях раённых газет Мінскай вобласці. А з 1966 года ён узначальвае рэдакцыю газеты «Сцяг працы». Аляксандр Пятровіч — член бюро Пухавіцкага РК КПБ, дэпутат райсавета.

Акрамя журналісцкай і грамадскай дзейнасці, А. П. Грышан вядзе і літаратурную работу. Цяпер ён рыхтуе кнігу, прысвечаную гісторыі Пухаўшчыны.

**Ан. ЯРОХІН.**



НА ЗДЫМКУ: А. П. ГРЫШАН.

Фота В. Паўловіча.

## З ПАЧУЦЦЁМ УДЗЯЧНАСЦІ




Рэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Аргкамітэт фестывалю дружбы універсітэтаў саюзных рэспублік адзначае высокае пачуццё патрыятызму, дысцыплінаванасць, арганізаванасць і актыўнасць удзельнікаў дэлегацыі, якая прадстаўляла ваш універсітэт на Усесаюзнай універсіядзе, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Выказваем пачуццё шчырай удзячнасці ўсяму калектыву, які выхоўвае студэнтаў у духу ленінскага інтэрнацыяналізму і гарачай любві да сваёй многанацыянальнай сацыялістычнай Радзімы.

Мы ўпэўнены, што сяброўскія сувязі паміж універсітэтамі саюзных рэспублік будуць няўхільна расці і мацнець.

З найлепшымі пажаданнямі

В. І. ХАТКЕВІЧ, прафесар, старшыня аргкамітэта фестывалю, рэктар Харкаўскага ордэна Працоўнага Чырвонага сцяга дзяржаўнага універсітэта імя А. М. Горкага, член-карэспандэнт АН УССР.

## МІНСК—ВАРШАВА—МІНСК

Па запрашэнню Варшаўскага політэхнічнага інстытута і спартыўнага клуба «Політэхнікі Варшавске» спартсмены нашага універсітэта (жаночая і мужчынская баскетбольныя каманды) у колькасці 28 чалавек з 10 па 16 мая былі ў Варшаве, дзе прынялі ўдзел у спартыўным турніры, прысвечаным 25-годдзю Польскай Народнай Рэспублікі.

— Ну, і як? — спытаюць балельшчыкі.

— Усё ў парадку, таварышы балельшчыкі, — адказваюць нашы спартсмены.

З першай гадзіны нашага знаходжання ў Варшаве прадстаўнікі Беларусі былі жаданымі гасцямі польскіх студэнтаў. Сардэчная дружба, сяброўская цеплыня гаспадароў суправаджалі нас усюды.

Праграма нашага знаходжання была настолькі насычанай, змястоўнай і разнастайнай, што шэсць дзён на польскай зямлі прайшлі вельмі хутка.

Наша дэлегацыя прымала ўдзел у X спартакіядзе AZS, якая праходзіла на цэнтральным студэнцкім стадыёне ва ўрачыстых абставінах пры запоўненых да адказу трыбунах.

Ну, а як жа сыгралі нашы? Жаночая баскетбольная каманда пад кіраўніцтвам трэнера Георгія Грудо і капітана каманды студэнткі IV курса матфака Ларысы Макрусёвай абедзве сустрэчы выйграла з розніцай у 26 ачкоў. Мужчынская каманда (трэнер Віталь Шахіньян, капітан каманды студэнт III курса фізфака Саша Малышаў) у першай сустрэчы перамогу ўступіла сапернікам, а ў другой выйграла з розніцай у 14 ачкоў.

Польскія студэнты і суддзі міжнароднай катэгорыі былі аб'ектыўнымі. Трыбуны бурна выражалі свае сімпатыі да беларускіх спартсменаў. «Сто лят Сашы Малышаву і Тамары Кабанавай», — дружна жадалі польскія студэнты.

Нашай дэлегацыі выпаў гонар балець за нашу савецкую каманду на Цэнтральным Варшаўскім стадыёне 12 мая — у дзень старту велагонкі свету.

А 15 мая ў зале вучонага савета інстытута рэктарат арганізаваў сустрэчу з усёй дэлегацыяй. Рэктар інстытута прафесар, доктар Антоній Кілынскі павіншаваў нашых спартсменаў з перамогай і падкрэсліў важнасць сяброўскіх сувязей савецкага і польскага народаў.

Многа было сустрэч і з іншымі маладзёжнымі і спартыўнымі калектывамі Варшавы. Усюды мы адчувалі гасціннасць, сардэчнае выражэнне дружбы нашых народаў.

24 чэрвеня польскія студэнты-спартсмены будуць гасцямі нашага універсітэта. І мы ўпэўнены, што гэта сустрэча яшчэ больш умацуе нашу дружбу.

**У. МУХАЕЎ,**
кіраўнік дэлегацыі.

## ЛЕНІН—НАШ СЦЯГ, ЛЕНІН—НАША СІЛА!

Бессмяротныя ідэі Леніна сталі блізкімі сэрцу замежных студэнтаў, якія вучацца ў навучальных установах рэспублікі.

Нядаўна ў нашым універсітэце адбылася інтэрнацыянальная студэнцкая навукова - тэарэтычная канферэнцыя на тэму «Уладзімір Ільіч Ленін— правадыр і настаўнік працоўных усяго свету».

У актавай зале галоўнага корпуса сабраліся вучоныя і студэнты. Сярод іх прадстаўнікі гераічнага В'етнама, студэнты з Кубы, Афганістана, Сірыі, Лівана, Ганы, Танзаніі і другіх краін.

З уступным словам перад удзельнікамі канферэнцыі выступіў член-карэспандэнт АН БССР прафесар В. І. Сцяпанаў. Ен сказаў: «Усюды на зямлі, дзе працуе чалавек, з глыбокім захапленнем і сардэчнай удзячнасцю вымаўляецца імя Леніна, якое стала родным і блізкім для кожнага чалавека працы».

На канферэнцыі было заслухана 10 дакладаў, з якімі выступілі студэнты-іншаземцы. У дакладах знайшлі адлюстраванне наступныя пытанні: «Ленінізм — новы этап у развіцці марксізма» (Маджэд Алі, Ліван), «У. І. Ленін аб міжнародным значэнні Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі» (Фунг Ван Зуан, ДРВ), «У. І. Ленін аб нацыянальна-вызваленчым руху ў эпоху імперыялізму» (Роберт Кейге, Кенія), «У. І. Ленін аб амерыканскім імперыялізме — душыцелю свабоды і незалежнасці народаў» (Чан Вьет Хунг, ДРВ), «У. І. Ленін і рэвалюцыя на Кубе» (Гра Рафаэль, Куба) і іншыя.

Студэнт з Танзаніі Чарльз Сомпал у сваім дакладзе «Ленінскія ідэі індустрыялізацыі і кааперавання сельскай гаспадаркі і вопыт краін Афрыкі» падкрэсліў, што сацыялізм з'яўляецца адзіным шляхам, які выбрала яго краіна, што ідэі Леніна, вопыт краін сацыялізма з'яўляюцца асновай для прагрэсу танзанійскага народа. Ён сказаў: «Увесь танзанійскі народ будзе сустракаць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, бо Ленін з'яўляецца кіраўніком усіх народаў, у тым ліку і народа Танзаніі».

«Мы заўсёды гаворым: справа Леніна бессмяротная. Ленін — наш сцяг, Ленін—наша сіла. З Леніным мы пераможам!»— сказаў у заключэнні свайго даклада Фунг Зуан (ДРВ).

Студэнт з Лівана Маджэд Алі так закончыў свой даклад: «Я не магу не схіляцца перад велічнасцю Леніна. Ён вялікі, як ніхто на зямлі».

Канферэнцыя прайшла з вялікім поспехам.

С. ЗАПАТРЫН,
старшы інспектар дэканата.

## СВЯТА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БАЛГАРЫІ

*Вялікая дружба звязвае наш універсітэт з Сафійскім універсітэтам імя Клімента Ахрыдскага. Традыцыйнымі сталі студэнцкія сустрэчы, узаемны абмен дэлегацыямі і групамі практыкантаў, сумесны ўдзел у навуковых канферэнцыях.*

*Сёння мы горача віншуем брацкі універсітэт, які святочна адзначае 80-годдзе з дня заснавання.*



*На здымку: дэлегацыя работнікаў навукі і асветы БНР на прыёме ў рэктара нашага універсітэта А. Н. Сеўчанкі.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

# З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА ...НАСТАЎНІК

**Штогод вялікі атрад выпускнікоў нашага універсітэта накіроўваецца на работу ў якасці настаўнікаў агульнаадукацыйнай школы. Вывучэнне вопыту іх работы пераканаўча паказвае, што гэтыя выкладчыкі маюць грунтоўную навуковую падрыхтоўку і добра спраўляюцца са зместам вучэбнага матэрыялу, але слаба падрыхтаваны метадычна, не ўмеюць эфектыўна перадаваць веды вучням, недастаткова выкарыстоўваюць разнастайныя метады і прыёмы навучання і нездавальняюча валодаюць навыкамі выхаваўчай работы. Адсюль ясна, якое важнае месца павінна заняць педагагічная практыка будучых настаўнікаў у школах.**

**За апошнія два гады адносіны адміністратараў, кафедр і саміх студэнтаў да педагагічнай практыкі змяніліся ў лепшы бок. Павысіліся патрабаванні кіраўнікоў факультэтаў і выкладчыкаў кафедр, паднялася адказнасць і студэнтаў за даручаную справу. Гэтыя змены асабліва характэрны для практыкантаў-студэнтаў геаграфічнага, хімічнага, філалагічнага і іншых факультэтаў.**

**Студэнты геаграфічнага факультэта, якія праходзілі практыку ў школах горада, паказалі добрую падрыхтоўку па свайму прадмету, асновы разумення методыкі і ўменне весці выхаваўчую работу з вучнямі. Дырэкцыя і завучы школ, настаўнікі і метадысты адзначаюць іх добрасумленнасць, адказнасць і вялікую зацікаўленасць, імкненне ведаць, разумець і здзяйсняць найбольш эфектыўныя метады навучання і выхавання.**

**Разам з тым нельга не указаць і на шэраг ценевых бакоў. Вялікая неарганізаванасць у нас з размеркаваннем і замацаваннем студэнтаў за школамі. У сярэднія школы №№ 17, 40, 74 у пачатку практыкі быў накіраваны 21 матэматык. «Дацягнулі» практыку толькі чатыры чалавекі. У школе № 74 спачатку працавала 8 фізікаў, а к канцу засталіся толькі двое.**

**Недастатковы кантроль дэканата за праходжаннем практыкі, невысокая патрабавальнасць метадыстаў, класных кіраўнікоў і настаўнікаў, дрэнныя адносіны некаторай часткі студэнтаў да работы ўвогуле, і асабліва выхаваўчай, абясцэньваюць час знаходжання студэнтаў у школе. «Пальма першынства» належыць тут, безумоўна, біялагічнаму факультэту. Студэнты біяфака не толькі дрэнна падрыхтаваны метадычна, але і безадказна адносяцца да практыкі. Аўтару гэтых радкоў вось ужо два гады так і не ўдаецца дабіцца хоць бы пасрэдных адносін практыкантаў да работы. На жаль, работнікі дэканата застаюцца глухімі да скаргаў школ і метадыстаў.**

**Ёсць і яшчэ адна праблема, якая патрабуе рашэння ва універсітэцкім маштабе. Многія студэнты-практыканты не ведаюць, дзе яны будуць працаваць пасля заканчэння універсітэта — у школе, на заводзе ці ў навуковых лабараторыях. А ім гэта патрэбна ведаць загадзя.**

**Пераадолеўшы гэтыя і іншыя недахопы, наш універсітэт будзе даваць школам рэспублікі і Саюза высокакваліфікаваных педагогаў, якія ўмела змогуць вырашаць складаныя вучэбныя і выхаваўчыя задачы.**

**С. РАДОЎСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры педагогікі і псіхалогіі.**



На здымку: студэнты-радыёфізікі на практычных занятках у антэннай лабараторыі.
Фота Я. ДАНІЛАВА.



## СЕСІЯ ● СЕСІЯ

*Не адну гадзіну правялі студэнты падрыхтоўчага факультэта за работай I таму перад хуткімі сустрэчамі з экзаменатарамі ім няма чаго губляцца (здымак уверсе).*

*Нельга ўявіць хіміка без лабараторыі.*

*На здымку: студэнткі другога курса хімфака Е. Халецкая і Т. Янова выконваюць практычную работу па фізкалоіднай хіміі.*



*Фота Я. ДАНІЛАВА і Л. КАЛЮЖНАЙ.*

# НЕ АДКРЫЦЬ БЫ НАМ АМЕРЫКУ

Нядаўна, праглядаючы леташні карэспандэнцкі блакнот, успомнілася сустрэча з сябрамі-другакурснікамі пасля першай вучэбнай практыкі. Шумна было тады, весела. Наперабой дзяліліся ўражаннямі, а іх — хоць адбаўляй.

«Гадзін каля 11 раніцы з'яўляюся перад загадчыкам аддзела рэдакцыі, да якога мяне накіравалі. Бяру заданне, паехаў... З паўгадзіны гутару з героем будучага матэрыялу.

Неўзабаве манускрыпт гатоў. Да вечара яго наспех прагледзеў рэдактар — і ў набор... Раздолле! А заўтра-паслязаўтра матэрыял ужо на паласе. І так за 20 дзён практыкі — добрага паўтара дзесятка матэрыялаў, як з пушкі»...

А ці ж кінулася табе, практыкант, у вочы шэрасць і манатоннасць іх, тваіх матэрыялаў? Ці не адчуў ты, што выкананы яны, як кажуць, на адной струне, казённа? Ці не заўважыў, што «патанулі» яны на паласе?

— А што тут такога, як і у кожнай раёнцы, — адкажаш ты.

Так, амаль як у кожнай. А шкада!

І яшчэ: ты спрабаваў сказаць што-небудзь сваё?

— Намеснік рэдактара не згодзен, — адпарыруеш ты.

— Магчыма. Часам і такое бывае.

Прынёс я аднойчы ў другой палове практыкі такі матэрыял — лірычны рэпартаж аб агітбрыгадзе раёна. Дыктую машыністцы. Не вытрымала яна: «Ты б, Толя, спачатку намесніку рэдактара даў выправіць, а то адкрыем мы з табой Амерыку...»

— Нечага нам пра лісточкі, кветачкі ды пра сонейка. Нам факты патрэбны— не для нас гэта лірыка, — чую такі прысуд.

І вось абскублены «лісточкі», закрэслены «кветачкі», замест «сонца» — неба шэрае. Нарэшце, твой матэрыял, як усе: нудны, шэры, бяздушны... у наступным нумары газеты.

Аднак ты — чалавек упарты. «Нічога, — думаеш, — напішу наступную рэч больш глыбокую па зместу і падтэксту, каб, як кажуць, душа героя прасвечвалася!» Цябе з радасцю накіроўваюць у шматдзённую камандзіроўку: людзей вывучай, жыццё пазнавай, з героямі жыві.

Дэталёва азнаёміўшыся з гаспадаркай, пішаш матэрыялы і аб рабоце камсамольскай арганізацыі, і аб насценным друку, і аб працаўніку, чые рукі хлеб вырошчваюць. Рэдактар з цябе не нарадуецца: добрыя, відаць, задаткі.

А кіраўнік практыкі на факультэце скажа: «Што ж ты цэлую практыку ў адным калгасе пасвіўся!» І дарэмна будзеш спрабаваць давесці, што «не ўсю практыку», а толькі трое сутак з дваццаці, што спрабаваў пазнаць сёе-тое ў жыцці. Шкада, што і такое бывае!

Раёнка... Няхай і не на ўсіх лятучках ты прысутнічаў, а характэрную рысу адчуць няцяжка. Як яны ў асноўным праходзяць? Палову ці амаль палову адведзенага на іх часу сакратар, дымячы не першай цыгарэтай, пытае:

— Хто яшчэ што мае для наступнага нумара? — Маўчанне.

— Значыць, ніхто больш не дае? — Зноў маўчанне. Тады ён абвяшчае:

— Радкоў са 180 не хапае.

— Дадзім, — суцяшае яго намеснік рэдактара.

Напісаны за адзін прысест матэрыял нават аўтару не падабаецца. Аб дапрацоўцы і размовы ісці не можа (што ж, нумар «гарыць»!)

А меркаванне чытача? Ён ужо прывык да трафарэту інфармацыі, да аўтабіяграфічнага шаблону замалёвак, зробленых па схеме: даты — прозвішчы — рысы характару. І што ж у выніку?

— Жонка! Раёнку прынесілі? А вось яна... Што там сёння па тэлебачанню?

Дарэчы успомніць і нядаўнюю сустрэчу студэнтаў факультэта журналістыкі з некаторымі рэдактарамі раённых газет. «Цякучка заядае, — білі яны сябе ў грудзі. — Гэта ж вам не «Правда».

Так, не «Правда». І асабліва ў перыяд летніх водпускаў. А што, калі зрабіць трывалы «загон» хрыбетных матэрыялаў на 3—4 нумары. І не пераказаў біяграфій герояў у шаблонных замалёўках.

Асабліва гэта датычыць маладога папаўнення арміі журналістаў.

Будзем верыць, што поспех спадарожнічае толькі настойлівым. **А. ГРУША,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

# У ЛЕНІНСКІМ ПОШУКУ

**На мінулым тыдні ў Маскве адбылася Усесаюзная нарада-семінар рэдактараў шматтыражных газет універсітэтаў і педагагічных інстытутаў, прысвечаная падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.**

У Цэнтральным доме журналіста, дзе праходзіла нарада, сабраліся журналісты з Ленінграда і Ульянаўска, Казані і Кірава, з Томска, Омска, Барнаула, Адэсы, Астрахані і іншых гарадоў, прадстаўнікі студэнцкіх газет з Казахстана, Кіргізіі, Туркменіі, Літвы і іншых рэспублік.

Цёпла вітала рэдактараў шматтыражных газет і ўзначаліла работу нарады галоўны рэдактар «Учительской газеты» Надзежда Міхайлаўна Парфёнава. Яна падкрэсліла асаблівасці падрыхтоўкі да ленінскага юбілею, важнасць далучэння моладзі да ленінскай тэмы, неабходнасць лепш рыхтаваць да школы будучых педагогаў.

Рэдактар газеты «Ленінградскі універсітэт» П. І. Успенскі падзяліўся вопытам асвятлення на старонках шматтыражкі паўнакроўнага студэнцкага жыцця, расказаў аб актыве газеты, яе накіраванасці, аб шэфскіх сувязях з завадской шматтыражкай і зарубежнымі універсітэтамі.

Разгарнуўшы падрыхтоўку да ленінскага юбілею, рэдкалегія ўвяла новыя рубрыкі «Размова з таварышам Леніным», «Ленінскія ідэі ў навуцы», «Лаўрэаты Ленінскай прэміі», «Кавалеры ордэна Леніна», «Выдавецтва — юбілею», «Навука — універсітэт — вытворчасць» і іншыя. Пад гэтымі рубрыкамі публікуюцца матэрыялы аб паўсядзённай рабоце студэнцкіх груп, спаборніцтвах, успаміны і дакументальныя запісы.

Расказваючы аб газеце Маскоўскага педагагічнага інстытута, Л. І. Пятрова прывяла цікавыя прыклады своеасаблівага падыходу да ленінскай тэмы. Так, была праведзена вялікая работа па збору матэрыялу аб наведанні У. І. Леніным інстытута. Яркай, хвалюючай падзеяй застаўся ў памяці студэнтаў юбілей Н. К. Крупскай. На старонках газеты выступілі людзі, якія блізка ведалі Надзежду Канстанцінаўну.

Часта публікуюцца ў газеце рэцэнзіі на кінафільмы па ленінскай тэматыцы, студэнцкія даследаванні.

У Адэскім універсітэце далучылі да ўдзелу ў падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння Ільіча старых бальшавікоў, якія бачылі, чулі, гутарылі з Леніным.

Пад рубрыкай «Ленін ў лёсе маім» на старонках універсітэцкай шматтыражкі выступаюць былыя рабочыя, сяляне, якія сталі вучонымі, студэнты, аспіранты.

Студэнты Пермскага педінстытута вылучылі лозунг «Вучыцца без троек». На старонках газеты разгарнулася ажыўленая дыскусія, вынікі якой падвёў прарэктар. А ў абавязацельствах з'явіўся пункт — грамадскія навукі вывучаць без троек.

Члены рэдкалегіі, актыў газеты любяць і ўмеюць шукаць і прыносяць у рэдакцыю вельмі цікавыя матэрыялы. Дыялекталагічная экспедыцыя, напрыклад, адшукала хадака да Леніна, і ў газеце была апублікавана гутарка з ім. Па ленінскай тэматыцы працуе і студэнцкая піянерская кафедра. Гасцямі рэдакцыі былі людзі, якія сустракаліся з Н. К. Крупскай.

Аб сваіх знаходках у асвятленні ленінскай тэмы расказалі рэдактары газет Кіравабадскага, Ленінабадскага, Камянец-Падольскага, Пяцігорскага інстытутаў, Туркменскага, Казахскага, Таджыкскага універсітэтаў, універсітэта дружбы народаў і іншых шматтыражных газет.

У кіравабадцаў — гэта конкурс вершаў, прысвечаных Леніну, ленінскі універсітэт у інтэрнаце, ленінскі пакой. У азербайджанскіх студэнтаў — новыя пераклады ўспамінаў аб Ільічу, старонкі аб Леніне, падрыхтаваныя старэйшымі камуністамі. Чарджоўскія следапыты адшукалі і апублікавалі туркменскія народныя песні аб Леніне і шукаюць іх аўтараў. Студкоры ў Камянец-Падольску распачалі ленінскі пошук па слядах дакументаў. Актыў газеты Пяцігорскага педінстытута стаў шэфам следапытаў, а рэдакцыя — штабам рэвалюцыйнай і працоўнай славы. Студэнты і выкладчыкі гэтага інстытута ўстанавілі ў гарах помнік загінуўшым воінам. На мітынг з выпадку яго адкрыцця з'ехаліся жыхары ўсяго раёна.

У Краснадарскім педінстытуце ўвайшлі ў практыку камсамольскія сходы — ленінскія чытанні, якія праводзяцца па тэзісах, распрацаваных кафедрай філасофіі.

Намеснік галоўнага рэдактара «Учительской газеты» М. Л. Шарыгін прааналізаваў поспехі і недахопы шматтыражных газет, сканцэнтраваў увагу на першачарговых задачах.

Начальнік упраўлення навучальных устаноў Міністэрства асветы СССР В. К. Розаў расказаў аб мерах па ўдасканаленню народнай адукацыі, заклікаў журналістаў удзяляць больш увагі ленінскаму запавету пастаянна вучыцца. Вучоба, падкрэсліў ён, галоўная форма працоўнага ўдзелу студэнтаў у падрыхтоўцы да юбілею.

З вялікай цікавасцю выслухалі ўдзельнікі нарады выступленні навуковага супрацоўніка Інстытута марксізма-ленінізма Т. Я. Панкратавай, журналістаў Ю. М. Юрава і Р. Я. Хаіта, якія вядуць ленінскі пошук.

А. НІКОЛЕНКА.

